Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ КЛАССЫ:
# ОПЫТ И ПЕРСПЕКТИВЫ

***Сборник материалов***
***II Республиканской научно-практической конференции***

Учебно-издательский центр БГПУ
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
БГПУ
2017

УДК 377.8
ББК 74.5
П24

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ,
рекомендовано секцией педагогических наук (протокол № 7 от 18.12.17)

Рецензенты:
*А. В. Торхова*, доктор педагогических наук, профессор,
проректор по научной работе учреждения образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»;
*В. Ф. Русецкий*, доктор педагогических наук, доцент,
начальник научно-исследовательского центра
НМУ «Национальный институт образования
Министерства образования Республики Беларусь»;
*И. А. Царик*, кандидат педагогических наук, доцент,
и. о. заведующего кафедрой педагогики
факультета социально-педагогических технологий
учреждения образования «Белорусский государственный
педагогический университет имени Максима Танка»

**Педагогические** классы: опыт и перспективы: материалы II Республи-
П24 канской научно-практической конференции, г. Минск, 3 ноября 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; под ред. А. И. Жука, А. В. Позняк. – Минск : БГПУ, 2017. – 325 с.
ISBN 978-985-541-541-406-4.

В сборнике обобщен опыт работы профильных классов / групп педагогической направленности в Республике Беларусь и определены перспективы педагогической профилизации в учреждениях общего среднего образования.

Адресуется педагогам, специалистам отделов и управлений образования, курирующим организацию профильной педагогической подготовки на III ступени общего среднего образования, всем заинтересованным лицам, педагогическим работникам, занимающимся вопросами непрерывного педагогического образования, профильной и допрофильной педагогической подготовки учащихся.

УДК 377.8
ББК 74.5

ISBN 978-985-541-406-4
© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КЛАСНАЯ ГАДЗІНА Ў 5-м КЛАСЕ «КАЛЕЙДАСКОП ПРАФЕСІЙ»

***А. П. Жалезнякова***
*ДУА «Гімназія № 20 г. Мінска»*

**Тэма: «Калейдаскоп прафесій»**

**Мэта:** пашырыць веды вучняў пра прафесіі людзей і інструменты, якія неабходны для пэўных прафесій, узбагачаць слоўнікавы запас вучняў; развіваць уменне працаваць у камандзе; выхоўваць павагу да людзей розных прафесій.

**Абсталяванне:** пазлы, канверты з заданнямі, мультымедыйная прэзентацыя, фатаграфіі і малюнкі з прафесіямі бацькоў, мяшок з прыладамі працы.

**Ход заняткаў:**

**I. У каробцы на настаўніцкім стале** ляжаць загадзя падрыхтаваныя пазлы. Вучням прапанавана скласці малюнак, і раздзяліцца на групы ў залежнасці ад малюнка, які атрымаўся.

Кожная група (каманда) займае сваё месца.

**Настаўнік:** Апішыце малюнак, які вас аб'яднаў у групу. Што на ім адлюстравана?

Вучні выказваюць свае думкі.

**Настаўнік:** Што аб'ядноўвае ўсе гэтыя малюнкі?

**Вучні:** Гэта малюнкі, на якіх паказаны людзі – прадстаўнікі пэўных прафесій.

**Настаўнік:** Што абазначае слова прафесія?

Вучні выказваюцца.

**Настаўнік:** Якія прафесіі вам вядомыя?

Вучні адказваюць.

**II. Заданне на складанне слова** (назвы прафесіі) з пераблытаных літар, запісаных на дошцы: ШКАВАЧ, ОВПРА, ЧУАР, АМКРА

Перамогу атрымоўвае тая каманда, якая хутчэй і правільней зробіць заданне.

**III. Усе вы добра ведаеце,** што кожны чалавек павінен працаваць, бо без працы немагчыма пражыць. А прылады працы ў прадстаўніка кожнай прафесіі свае.

Настаўнік прапаноўвае гульню «Чароўны мяшочак». У мяшочку складзены пэўныя прылады працы. Па чарзе ўдзельнікі кожнай каманды выцягваюць адтуль якую-небудзь рэч і адгадваюць, прадстаўніку якой прафесіі яна належыць. Калі вучань памыляецца, то адказ дае прадстаўнік каманды, які хутчэй падняў руку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Прадмет | Прафесія |
|---|---|
| чарпак | повар |
| фанендаскоп | урач |
| указка | настаўнік |
| пэндзаль | мастак |
| мікрафон | спявак |
| малаток | сталяр |
| грэбень | цырульнік |

А каму могуць належаць гэтыя прадметы? (На слайдзе ювелірныя вагі, нівелір). Чым займаюцца гэтыя спецыялісты?

**IV. Настаўнік:** Дзеці, дома вы рыхтавалі невялічкія паведамленні пра прафесіі вашых бацькоў.

Вучні паказваюць фатаграфіі або малюнкі, звязаныя з бацькоўскімі прафесіямі. Сцісла расказваюць пра іх працу.

**V. Настаўнік:** ёсць прафесіі, назвы якіх вам усім добра вядомы. Сёння мы неаднойчы некаторыя з іх упаміналі. Разам з гэтымі ёсць і прафесіі, якія з'явіліся надта даўно і сталі ўжо гісторыяй. Ёсць такія, што нядаўна ўвайшлі ў наша жыццё і яшчэ, можа, не ўсім вядомыя. Зараз кожная каманда атрымлівае канверт з карткамі, дзе знаходзяцца назвы прафесій і прыводзіцца апісанне іх значэння. Вам неабходна размясціць карткі парамі: назва прафесіі і яе апісанне.

**Канверт з заданнем для першай каманды (састарэлыя прафесіі)**

| | |
|---|---|
| рымар | слуга ў доме спадароў, карчме, гасцініцы |
| бондар | прыдворны чын, арганізатар палявання |
| лакей | спецыяліст па коннай збруі |
| лоўчы | майстар, які вырабляе ночвы, дзежы і інш. рэчы з дрэва |

**Канверт з заданнем для другой каманды (рэдкія прафесіі)**

| | |
|---|---|
| сурда-перакладчык | спецыяліст, які падтрымлівае ў добрым стане зялёныя газоны для гольфа, бейсбола, футбола і г. д. |
| пасціжар | прафесійны дэгустатар чаю |
| цітэстар | чалавек, які прафесійна валодае мовай жэстаў, пры дапамозе якой адбываюцца зносіны з людзьмі, пазбаўленымі слыху |
| грынкіпер | вырабляе на заказ вусы, косы, бакенбарды, бароды, парыкі |

**Канверт з заданнем для трэцяй каманды (новыя прафесіі)**

| | |
|---|---|
| рыелтар | чалавек, асноўнай задачай якога з'яўляецца забяспечанне працы офіса |
| дэкларант | спецыяліст па працы на мытні, які сочыць за афармленнем дакументацыі і рухам грузаў |
| офіс-мэнэджар | спецыяліст па продажу нерухомасці |
| капірайтар | стваральнік рэкламных тэкстаў |

**Канверт з заданнем для чацвёртай каманды (прафесіі будучага)**

| | |
|---|---|
| інжынер-кампазітчык | будзе распрацоўваць турыстычныя праграмы ў касмічную прастору, на лунныя базы і інш. |
| урбаніст-эколаг | вырошчвае садавіну і гародніну на дахах дамоў |
| сіці-фермер | праектуе новыя экалагічна чыстыя гарады |
| мэнэджар касматурызму | падбірае кампазітныя матэрыялы для вытворчасці, у тым ліку з выкарыстаннем 3d-друку, робататэхнічных прылад з зададзенымі характарыстыкамі |

Пасля выканання заданняў адбываецца іх абмеркаванне і вызначэнне пераможцаў.

**VI. Настаўнік:** спадзяюся, што сёння даведаліся многа новых прафесій, пра якія нават ніколі не чулі. Якая прафесія вам здалася самай незвычайнай? Якая здзівіла? А якую прафесію можна назваць самай галоўнай?

Вучні выказваюць свае думкі. Хто-небудзь абавязкова назаве прафесію настаўніка. Настаўнік просіць патлумачыць чаму?

Вучні выказваюцца.

**Настаўнік:** Хто ведае, дзе трэба вучыцца, каб атрымаць прафесію настаўніка? Дэманструецца скульптура настаўніцы ля БДПУ. (Слайд) Праводзіцца абмеркаванне.

Вучні адказваюць, настаўнік дапамагае, карэктуе, дапаўняе.

**Настаўнік:** Якімі якасцямі, на ваш погляд, павінен валодаць сучасны настаўнік? А якімі павінны быць вучні? Прадстаўнікоў якіх прафесій можна сустрэць у нашай гімназіі?

Вучні адказваюць.

**VII. Падвядзенне вынікаў. Вызначэнне пераможцаў.**



*Рисунок*